Фота Валерыя КАРАЛЯ.

■ Гісторыя ў рэчах

ТАЯМНІЦА БЕРАСЦЕЙСКАГА ПЯРСЦЁНКА

У старадаўнім Бярэсці было нямала заможных людзей. І толькі асобныя з іх маглі сабе дазволіць такое ўпрыгажэнне, як залаты пярсцёнак. Золата тады было іншае, ды і тэхналогіі вырабу рэчаў значна адрозніваліся ад цяперашніх. Іх выраблялі ўручную. І ад гэтага яны мелі яшчэ большую каштоўнасць.

Вось хадзіў такі вяльможа па вузкіх вуліцах Бярэсця, фрагмент якога адкрыты пад шкляным купалам для нашчадкаў на тэрыторыі Брэсцкай крэпасці... Але той шаноўны гараджанін не насіў сваю ювелірную каштоўнасць на пальцы, а захоўваў, хутчэй за ўсё, дома. Менавіта такую версію выказалі спецыялісты. Бо пярсцёнак велікаваты для цяперашняга сярэднестатыстычнага брастаўчаніна, а тады людзі былі значна меншыя. А можа, жыў адзін сярод іх, які вылучаўся аграмадным ростам і такімі ж пальцамі. Пярсцёнак зрабілі яму на заказ. Хто ведае?

Адным словам, шмат таямніц захоўвае ў сабе залаты выраб, які знайшлі яшчэ ў 1977 годзе пры раскопках старажытнага гарадзішча Бярэсце. Знаходку тады перадаў вучоным доктар гістарычных навук Пётр Фёдаравіч Лысенка, што кіраваў раскопкамі. Пярсцёнак вывучылі, вызначылі яго ўзрост, які вымяраецца больш чым сямю стагоддзямі, паставілі пробу золата — 750-ю — і перадалі на захаванне ў Брэсцкі краязнаўчы музей.

Цікава, што экспанат да гэтай пары ні разу не выстаўляўся. І вось музейныя работнікі палічылі, што прыйшоў яго час. Інтрыга трымалася да апошняга дня. Было аб'яўлена, што краязнаўчы музей праводзіць трохдзённую выставу аднаго экспаната, і ніхто не ведаў якога. На прэзентацыю сабралася шмат гасцей, сярод якіх былі кіраўнікі культурных устаноў Брэста, прадстаўнікі грамадскасці, нават дыпламаты, акрэдытаваныя ў нашым горадзе, а загадкавы экспанат так і хаваўся пад сінім пакрывалам. І вось роўна а 13 гадзіне, як і было сказана загадзя, яго знялі. Гэтае ганаровае права было дадзена **старшыні гарвыканкама Аляксандру РАГАЧУКУ**. Мэр першым жа і падзяліўся сваімі адчуваннямі. Сказаў, што рэч вельмі дастойная, майстэрства продкаў яго па-сапраўднаму ўразіла.

Падчас прэзентацыі спецыялісты расказалі, што пярсцёнак пачатку XVI стагоддзя быў выраблены з дапамогай валачэння, пляцення, пайкі, кавання — самых першых відаў апрацоўкі металу. Мужчынскае ювелірнае ўпрыгажэнне ўяўляе з сябе перавітыя ў касу чатыры тоўстыя жгуты шырынёй у цэнтральнай частцы 10 міліметраў. Канцы пярсцёнка адкрытыя, нязлучаныя. Яго дыяметр складае 20 міліметраў, а вага — 7,8 грама. У свеце вядомы толькі адзін падобны пярсцёнак, які захоўваецца ў Ноўгарадзе.

Экспанат не выстаўлялі раней найперш з меркаванняў бяспекі. Вось і цяпер пасля паказу ён зноў зойме сваё месца ў запасніках. А ў экспазіцыі з'явіцца яго сучасны двайнік. Не копію берасцейскага экспаната, а выраб па матывах знаходкі зрабілі на беларускім ювелірным заводзе «Зорка». Арыгінальны падарунак музею прэзентавала **дырэктар па маркетынгу прадпрыемства Юлія КЛІМІШЭНА.** Пярсцёнак выраблены з моднага зараз жоўтага золата, ён уяўляе з сябе 12 залатых дроцікаў, якія скручаны спачатку ў чатыры жгуты, потым у два і адзін. Сучасны ювелірны выраб наведвальнікі маглі разгледзець блізка, нават патрымаць і прымераць на палец. Нехта падказаў, што трэба пры гэтым загадваць жаданне...

Дырэктар Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея Аляксей МІЦЮКОЎ сказаў, што ў гэтым годзе брастаўчан чакае яшчэ некалькі выстаў з серыі «Унікальны экспанат». Такім чынам музей адстойвае статус роднага горада як культурнай сталіцы краіны.

Святлана ЯСКЕВІЧ

«Вясна красна на ўвесь свет!»



Усе словы крыжаванкі пачынаюцца з літары К.

Па гарызанталі: 1. Баваўняная, моцна праклееная тканіна аднаколернай афарбоўкі. **3.** Жанчына, якая сваімі паводзінамі, манерамі імкнецца падабацца мужчынам. **8.** Фатаграфічны здымак. **9.** Бальнічная ўстанова. **13.** Будзе час — будзе і ... (прык.). **14.** «Ды на першы дзень святых Вялікадней,\\Вясна ... на ўвесь свет!». З велікоднай песні валачобнікаў. **15.** Каса — дзявочая ... (прык.). **17.** Пасудзіна з ручкай для зачэрпвання вады. **18.** У адзенні не плывец, а ў кажуху не ... (прык.). **19.** Раструбы ў пальчатках. **20.** Напітак. **22.** Тое, што і кій. **24.** Знаўца і аматар кніг. **26.** Род папугаяў. **28.** Тое, што і першацвет. **29.** Пісанкі, або ...; велікодныя яйкі.

Па вертыкалі: 1. Тое, што і верхавы. **2.** «Зелянеюць зноўку лазнякі,\\А ў вясеннім небе — ... птушыны». З верша М. Танка «Вырай». **4.** На мове маленькіх дзяцей — яйка. **5.** ... мурлыча — гасцей кліча (прык.). **6.** Геаметрычнае цела. **7.** Задняя частка судна. **10.** Вялізны пітон з казкі Р. Кіплінга «Кніга джунгляў». **11.** Струнны смычковы музычны інструмент. **12.** Баравік, які расце ў час каласавання жыта. **15.** Аснова для страхі. **16.** «За вёскай — ля балоцінкі\\У галлі вярбы старой,\\Маленечкія ...\\Хаваліся вясной». З верша К. Цвіркі «За вёскай — ля балоцінкі». **19.** «Аб ёй мне баюць ...-сны\\Вясеннія праталіны». З верша Я. Купалы «Спадчына». **20.** Адна партыя якой-небудзь гульні. **21.** Чужы ... цела не грэе (прык.). **23.** «А вучні ... пахавалі\\І ўжо вялікадня чакалі». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Вялікдзень»). **24.** Прыйшлі ... на хаўтуры: верабейка памёр (прык.). **25.** Сухі марац, мокры май — будзе ... й каравай (прык.). **27.** Варона з кала — сем на ... (прык.).

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ:

Па гарызанталі: 1. Каленкор. 3. Какетка. 8. Картка. 9. Клініка. 13. Квас. 14. Красна. 15. Краса. 17. Карэц. 18. Касец. 19. Крагі. 20. Какава. 22. Кіёк. 24. Кніжнік. 26. Какаду. 28. Ключыкі. 29. Крашанкі. **Па вертыкалі:** 1. Коннік. 2. Крык. 4. Кока. 5. Кот. 6. Конус. 7. Карма. 10. Каа. 11. Кантрабас. 12. Каласавік. 15. Крохва. 16. Коцікі. 19. Казкі. 20. Кон. 21. Кажух. 23. Кніжкі. 24. Куры. 25. Каша. 27. Кол.

Склаў Лявон Целеш, *г. Дзяржынск.*

Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

Груша на прышчэпе рабіны

У суровыя зімы дрэвы грушы часта вымярзаюць цалкам. Пладовыя гадавальнікі не паспяваюць атрымліваць новыя саджанцы для пасадкі. Ды і сарты часам не тыя, што хацелася б пасадзіць у сябе на ўчастку. Але калі вырасціць у садзе іргу або рабіну, а затым прышчапіць на іх культурныя грушы, карлікавасць будзе забяспечана.

Асабліва проста атрымаць прышчэпы звычайнай чырвонай рабіны, але не ўсе сарты сумяшчальныя з такой прышчэпай. Пра тое, што прышчэпа і прышчэплены гатунак сумяшчальныя, можна даведацца ўжо праз 4-5 гадоў па месцы спайкі: калі наплыву няма і шчэпа не таўсцейшая за прышчэпу, падвойна-сартавую камбінацыю можна лічыць удалай. Пажадана прышчапляць маладыя прышчэпы, не старэйшыя за 2-3 гады, калі яны яшчэ не перараслі, кара лёгка адстае ад драўніны, прышчэпкі хутка прыжываюцца на прышчэпах. Улетку можна прышчапляць спячым вочкам. Спосаб прышчэпкі — акуліроўка або амерыканская прышчэпка шчыткам упрыкладку. Другі спосаб дазваляе расцягнуць тэрміны прышчэпкі на некалькі месяцаў незалежна ад руху соку; акуліроўка спячым вочкам у Т-падобны разрэз праводзіцца толькі ў перыяд актыўнага руху соку. У год прышчэпкі нельга абразаць прышчэпу, але вясной наступнага года гэта трэба зрабіць абавязкова, у адваротным выпадку прышчэпленыя вочкі так і не прачнуцца.

Калі ўсё зрабіць правільна, з прышчэпленай пупышкі вясной разаўецца парастак з прыкметамі шчэпы. Рэгулярныя палівы, падкормкі, рыхленне глебы ўжо ў першы год росту прышчэпленаму сорту грушы дазваляюць даць парасткі вышынёй 50-80 см. Калі прышчэплены саджанец дасягне вышыні 85-90 см, яго можна фарміраваць.

Увесну адмяраюць 50 см для штамба, над ім вылучаюць частку стволіка з 6 міжвузеллямі (тут будуць закладвацца бакавыя галіны грушы), усё астатняе зразаюць вострым садовым нажом над якой-небудзь нармальна развітай пупышкай.

Да восені вырастае стандартная двухгодка. Лепш перасаджваць на пастаяннае месца аднагодкі: яны лягчэй пераносяць перасадку, менш траўмуецца каранёвая сістэма. Крону фарміруюць непасрэдна ў садзе. Саджанцы, выгадаваныя сваімі рукамі, часта больш надзейныя за набытыя: сорт, які спадабаўся, загадзя вядомы, прышчэпа падабрана самастойна, ды і грошы можна сэканоміць немалыя.

Увосень вырываюць пасадачную яму глыбінёй 60-70 і шырынёй 80-100 см і саджаюць грушу гэтак жа, як і яблыні, але абараняць на зіму іх давядзецца больш старанна, прыкрываючы штамбы рубероідам, лапнікам і абкопваючы іх зямлёй перад маразамі. Ранняе абкопванне можа прывесці да падправання кары ў восеньскі перыяд з высокай вільготнасцю. Яшчэ лепш выкапаную яму пакінуць да вясны пустой, а ранняй вясной пасадзіць грушу. На зіму саджанцы прыкопваюць нахільна, прыкрываючы зямлёй траціну штамба; у такім стане саджанец грушы больш надзейна застрахаваны ад падмярзання ў суровую зіму.

Не даводзьце глебу да «нервовага зрыву»

Ці знаёмы вам выраз «знясіленне зямлі»? Агародніння культуры па-рознаму засвойваюць пажыўныя элементы з глебы, і калі іх высаджваць на адным і тым жа месцы шмат гадоў запар, гэта і прывядзе да знясілення ўрадлівага слоя.

У буракоў, морквы або рэдзькі даволі магутная каранёвая сістэма, і яна «выцягвае» калій і фосфар з глыбокіх слаёў зямлі. А зялёныя культуры, агуркі, цыбуля здабываюць харчаванне толькі з верхніх.

Пры адсутнасці пастаяннага севазвароту назапашваюцца пэўныя хваробы і шкоднікі. Неабходна не толькі мяняць месцамі расліны на агародзе, але і вытрымліваць пэўныя тэрміны.

Пры правільным севазвароце і пустазелля становіцца значна менш.

Вядома, большасць з нас гэта добра разумее, але, на жаль, не заўсёды правільна выконвае гэты самы севазварот. А потым здзіўляемся: і чаму ў гэтым сезоне такі слабы ўраджай? Ну нельга з года ў год вырошчваць на адным і тым жа месцы агуркі або цыбулю!

Трэба чаргаваць культуры з рознымі каранёвымі сістэмамі: глыбокай і неглыбокай.

Можна саджаць усе расліны пасля бабовых культур і пасля цыбулі і часнаку, за выключэннем іх саміх.

Рэгулярна ўносіць угнаенні, пажадана арганічныя: гной і кампост.

Пры гэтым трэба ўлічваць патрэбу раслін у тых ці іншых элементах харчавання, якая залежыць ад культуры, якая вырошчваецца, і ад саставу і пажыўнасці глебы. Напрыклад, зялёныя культуры, бульба, капуста патрабуюць азотных угнаенняў; памідорам і рэдзьцы трэба больш фосфару, а астатнім каранеплодам патрабуецца калій (ім нават пры пасадцы пажадана ўносіць попел).

Некаторыя не мяняюць месца пасадкі, а проста насыпаюць новую глебу на градку, папярэдне зняўшы з яе старую. Такі варыянт магчымы, але толькі насыпаць новай глебы трэба значную колькасць, інакш атрымаецца бескарысны занятак. Таму ўсё ж лепш чаргаваць культуры.

Абавязкова на свабодных ад пасадак плошчах вясной, летам і восенню выкарыстоўваць зялёныя сідараты, якія, безумоўна, паляпшаюць урадлівасць і састаў глебы.

Усе гэтыя мерапрыемствы дазволяць не давесці глебу да знясілення, ці, як жартам кажуць, да «нервовага зрыву». І ўраджай тады будзе заўсёды багатым.

Азбука народнай культуры

ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч

ЯЙКА велікоднае як абярэг. Пасля вяртання з храма адно асвячонае яйка маці-гаспадыня абавязкова клала за абразы. На працягу ўсяго года яно выконвала ролю надзейнага абярэга ад усялякіх непрыемнасцяў: ад хвароб дамачадцаў, сварак у хаце, ад штукарстваў дамавіка, ад маланкі і пажару. Такое яйка магло ляжаць тры і болей гадоў і не псавалася. У якасці абрадавага эквіваленту маглі захоўваць за абразамі толькі шалупінне ад першага з'едзенага яйка.

◈ У некаторых рэгіёнах яйка, якое захоўвалася за бажніцай на працягу года, выбіралі шляхам выканання спецыяльнага абрадавага дзеяння. У Вялікую суботу гаспадыня клала за бажніцу столькі яек, колькі чалавек жыло ў хаце, і да іх дадавала яшчэ адно. Назаўтра раніцай усе члены сям'і падыходзілі да абразоў і бралі адтуль па аднаму яйку для хрыстосавання ў час першай святочнай трапезы. Тое ж яйка, якое заставалася, апошняе, і лічылася моцным абярэгам-ахоўнікам.

◈ У абрадах беларусаў яйка-абярэг выконвала яшчэ і прадуцыравальную функцыю. Асабліва выразна яна прасочвалася ў абрадах сельскагаспадарчай і жывёлагадоўчай накіраванасці. Адно велікоднае яйка пакідалі для асвячэння зерня ў час засевак. Яго клалі ў сявеньку, з якой звычайна гаспадар выконваў самае першае засяванне. Ён браў яйка з сабой у поле і мог перад пачаткам работы з'есці яго сам або закапаць у зямлю, або раскрышыць і рассыпаць па ворыве. Людзі верылі, што выкарыстанне гэтага атрыбута будзе спрыяць захаванню ўраджаю ад маланкі, дажджу і ўсялякіх грызуноў.

◈ Велікоднымі яйкамі абменьваліся родныя і сваякі падчас святкавання Вялікадня, імі адорвалі валачобнікаў, яны выкарыстоўваліся ў абрадах першага выгану жывёлы ў поле і пры абходзе статку пастухамі.

Даты | Падзеі | Людзі

8 КРАСАВІКА

1336 год — нарадзіўся Тамерлан (Цімур), сярэднеазіяцкі дзяржаўны дзеяч, палкаводзец, эмір, стваральнік буйной дзяржавы са сталіцай у Самаркандзе, заснавальнік дынастыі Цімурыдаў. Яшчэ ў юнацтве праявіў сябе як актыўны палітычны дзеяч і ваенная фігура. Стаўшы кіраўніком Самарканда, ён стварыў вялікую армію і здзейсніў мноства паходаў. Такім чынам ён пашырыў сваю імперыю, якая распасціралася ад ракі Волгі і Каўказскіх горных хрыбтоў на захадзе да Індыі на паўднёвым захадзе. Цэнтр імперыі быў у Сярэдняй Азіі, у Самаркандзе. Першыя гады свайго праўлення Цімур прысвяціў усталяванню парадку ў краіне і бяспекі на яе межах (барацьба з мяцежнымі эмірамі, паходы на Сямірэчча і Усходні Туркестан). Цімур карыстаўся сярод свайго войска безумоўным аўтарытэтам і мог цалкам спадзявацца на сваіх паплечнікаў. Ён унёс выдатны ўклад у нацыянальную дзяржаўную сістэму, адукацыю і культуру, у агульнае развіццё сваёй дзяржавы, садзейнічаў будаўніцтву манументальных гістарычных будынкаў, асабліва ў Самаркандзе, шэраг з якіх можна ўбачыць і сёння.

1580 год — 435 гадоў з часу нараджэння (г. Пінск) Лявонція Карповіча (свецкае імя Лонгін, Лагін), беларускага праваслаўнага дзеяча, пісьменніка-публіцыста спаўняецца ў гэтым годзе. Адзін з пачынальнікаў айчыннага сістэматычнага багаслоўя. Узначальваў навуковую і выдавецкую дзейнасць Віленскага праваслаўнага брацтва, быў рэктарам брацкай школы. Выступаў у абарону праваслаўя, супраць Брэсцкай уніі 1596 г. Садзейнічаў выданню «Граматыкі» М. Сматрыцкага. Заснавальнік і першы архімандрыт Віленскага братняга Святадухава манастыра. Памёр каля 1620 года. У 2011 г. далучаны Беларускай Праваслаўнай Царквой да ліку мясцова ўшанаваных святых.

1973 год — адбыўся першы званок з мабільніка. Яго зрабіў амерыканец украінскага паходжання, канструктар кампаніі Motorola Марцін Купер. Ён патэлефанаваў з нью-ёркскай вуліцы свайму галоўнаму канкурэнту Жаэлю Энгелю з Bell Labs і спытаў: «Адгадай, адкуль я тэлефаную? Я тэлефаную табе з сотавага тэлефона!». Гэты званок стаў пачаткам новай эпохі ў галіне тэлекамунікацый. Ён быў зроблены з тэлефона мадэлі Motorola «DynaTAC», які важыў 1,15 кг, меў даўжыню каля 30 см і 10 см у шырыню. Тэлефон складаўся з 2 тысяч дэталяў, зараджаць яго трэба было 10 гадзін, а трымаў зарад ён каля 20 хвілін. Каштавала такая мадэль 7800 долараў (у сённяшнім эквіваленце). У 1975 годзе на планеце было толькі 5 тысяч карыстальнікаў сотавай сувязі. Сёння ж мабільнымі тэлефонамі карыстаецца палова жыхароў планеты — 3,6 млрд чалавек, а 2,6 млрд маюць смартфоны.

Было сказана

Мікола АРОЧКА, паэт:

Тым зайздрошчу,
Хто многа шляхоў абышоў.
І цяпер — з багажом за плячыма.

СЁННЯ

Сонца	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск	6.26	19.58	13.32
Віцебск	6.14	19.49	13.35
Магілёў	6.16	19.48	13.32
Гомель	6.15	19.42	13.27
Гродна	6.42	20.12	13.30
Брэст	6.45	20.10	13.25

Месяц

Апошняя квадра 12 красавіка.
Месяц у сузор'і Стральца.

Імяніны

***Пр.** Алы, Ганны, Ларысы, Васіля.*
***К.** Юліі, Максіма, Севярына.*

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ЗАЎТРА



Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— невялікія геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура

...у суседзяў

ВАРШАВА +10..+12°С	КІЕЎ +8..+10°С	РЫГА +11..+13°С
ВІЛЬНЮС +11..+13°С	МАСКВА +5..+7°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +5..+7°С

УСМІХНЕМСЯ

— Ты заўсёды пагаджаешся са сваёй жонкай?
— Далёка не заўсёды.
— А як яна да гэтага ставіцца?
— Яна пра гэта не здагадваецца!

Крышціяну Раналду працягне спартыўную кар'еру ў ханты-мансійскім «Нафтавіку».

Славуты футбаліст заявіў, што галоўнай прычынай яго пераходу ў гэты клуб стаў спартыўны складнік, прыемны клімат рэгіёна і турнірныя перспектывы каманды.

У псіхолага:
— Што ў вас за праблема?
— Я чую агідныя галасы.
— Якія?
— Ну вось зноў.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 44 12, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 40 91 92, Магілёве: 32 74 31, па Мінскай вобл.: (017) 292 21 03; бухгалтэрыі: 287 18 81.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.007. Індэкс 63850. Зак. № 1491.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 7 красавіка 2015 года.